Возрождение таких форм музыкального искусства расширяет белорусское музыкально-певческое творчество.

К музыке православной церкви в своем творчестве обращаются композиторы С.Бельтюков, О.Залетнев, М.Васючков, Э.Наско, В.Капытько, А.Козлова, О.Ходоско и др. Православные национальные традиции музыкально-певческого искусства воплощаются в их произведениях и воссоздают дух национальной культуры в новых культурно-исторических условиях.


1. *Густова Л.А.* Музыкально-певческое искусство православной церкви Беларуси: Дис... канд. искусствоведения. — Мн., 2001.

2. *Антаневіч В.А.* Гісторыя беларускай музыкі. — Мн., 1992.

3. *Гісторыя* Беларусі: Вучэб. дапам. / Пад рэд. Я.К.Новіка, Г.С.Марцуля. — Мн., 1998.

4. *Густова Л.А.* Богаслужэбныя спевы ў Беларусі: традыцыі і сучаснасць // Праваслаўе ў Беларусі і ў свеце. — Мн., 1994.

5. *Дадиомова О.В.* Музыкальная культура городов Беларуси в ХУIII веке. — Мн., 1992.

6. *Мдзівані Т.Г., Сергіенка Р.І.* Кампазітары Беларусі. — Мн.,1997.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Л.М.Рагачова,**
*дацэнт*

## КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫ ПАДЫХОД ДА ВЫХАВАННЯ БУДУЧЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

Выхаванне як арганічная частка адукацыйнага працэсу з'яўляецца сацыяльным інстытутам, і таму на яго функцыянаванні адбіваюцца ўсе праблемы і складанасці

сацыяльнага развіцця грамадства. Трансфармацыя існаваўшай у Беларусі сацыяльна-эканамічнай сістэмы, яе функцый, структуры, ідэалогіі аказала ўздзеянне на ўсю сацыякультурную сітуацыю краіны, запатрабавала яе пераўтварэння і перш за ўсё рэфармавання адукацыйна-выхаваўчых структур, якія павінны забяспечваць неабходныя ўмовы для выхавання новых пакаленняў.

У якасці вядучага сістэмаўтваральнага кампанента любой выхаваўчай сістэмы выступае мэта. Чалавечая дзейнасць заўсёды носіць мэтанакіраваны характар. Вобраз, які чалавек стварае ў сваім уяўленні, будуецца на падставе асэнсавання назапашанага вопыту, вылучэння яго станоўчых і адмоўных рыс, уліку асобаснай і агульначалавечай значнасці. Наяўнасць абгрунтаванай мэты забяспечвае стварэнне стройнай, лагічнай, паслядоўнай сістэмы дзеяння, якая накіравана на дасягненне мяркуемага выніку. І наадварот, страта аб'ектыўных асноў для ўпэўненай дзейнасці вядзе да выпадковых, унутрана супярэчлівых дзеянняў, якія дысгарманічна ўплываюць на развіццё любога працэсу. Асабліва негатыўна такі стан адбіваецца на выхаванні падрастаючага пакалення.

У пераломныя моманты актуальнасць праблемы фарміравання асобы ўзрастае, таму што менавіта ад гатоўнасці, намаганняў, адказнасці і актыўнасці кожнага чалавека залежыць паспяховае пераадоленне крызісных станаў у развіцці грамадства.

Адметнай рысай сучасных педагагічных ведаў з'яўляюцца адыход ад жорсткіх прадпісанняў і настаўленняў у арганізацыі адукацыйна-выхаваўчага працэсу, пошук шляхоў забеспячэння прыярытэтнасці асобы выхаванца, зберажэння яго непаўторнасці і унікальнасці. Гэтая выхаваўчая парадыгма ўзнікла на падставе крытычнага асэнсавання дамінуючай доўгі час на еўрапейскай прасторы рацыянальнасці ў гуманітарных ведах, вынікам якой з'явіліся спрошчанае ўяўленне аб чалавеку, заключэнне яго ў пэўныя

рамкі, якія будаваліся на падставе універсальных заканамернасцей развіцця асобы і грамадства. На гэтай агульнаметадалагічнай базе сцвердзілася аб'ектная, фарміруючая педагогіка, якая разглядае выхаванцаў як своеасаблівы "будаўнічы матэрыял", з якога трэба стварыць запланаваны "будынак". Практыка такога падыходу прывяла да сітуацыі, калі ў працэсе выхавання ўвесь унікальны творчы патэнцыял чалавека быў выціснуты за сферу інтарэсаў як педагагічнай тэорыі, так і канкрэтнай педагагічнай дзейнасці. Галоўнымі параметрамі для фарміравання мэт выхавання, а значыць, і самога працэсу выхавання асобы сталі сацыяльна значныя якасці, а сам чалавек аказаўся адчужаным ад прыроды, культуры, прадуктаў вытворчасці, ад самога сябе як каштоўнасці. Гэта стала прычынай страты ім актыўнай жыццёвай пазіцыі, якая заўсёды грунтуецца на імкненнях да самавыяўлення, самарэалізацыі, на дасягненні грамадскага прызнання асобаснай значнасці.

Таму з сярэдзіны XX ст. актывізаваўся працэс пошуку новай парадыгмы выхавання, яна павінна быць зарыентавана на дасягненне кожным чалавекам "унутранага духоўнага росту і самаразвіцця, якія выходзяць з прыродных патэнцый самога арганізма". Гэта зыходная пазіцыя з'яўляецца стрыжнёвай ідэяй гуманістычнай педагогікі, якая разглядае чалавека як вышэйшую каштоўнасць, як меру дасягненняў і перспектыў грамадства. Вядомы французскі вучоны Клод Леві-Строс некалькі дзесяцігоддзяў таму выказаў важную думку, якая прымушае чалавецтва задумацца аб будучыні. Ён адзначыў, што "XXI стагоддзе будзе стагоддзем гуманітарных ведаў, калі яно будзе ўвогуле".

Калі разумець пад гуманітарнымі ведамі спосаб асэнсавання чалавекам і грамадствам праблем свайго існавання і развіцця, тады вылучэнне педагагічнай навукай ідэалаў выхавання моладзі, шматграннасць і складанасць гэтага працэсу ва ўмовах новага светаўспрымання чалавека

ў XXI ст. з'явяцца сістэмаўтваральнымі кампанентамі для мадэлявання новай выхаваўчай парадыгмы.

Найбольш адпавядае арганізацыі выхавання падрастаючага пакалення на сённяшні дзень культуралагічны падыход, сутнасць якога заключаецца ў разуменні выхавання як культурнага працэсу, што ажыццяўляецца ў культураадпаведным асяроддзі, усе кампаненты якога прасякнуты чалавечым сэнсам і спрыяюць індывідуальнаму развіццю. Гэты падыход дазваляе гарманічна спалучаць у працэсе развіцця асобы біялагічнае і сацыяльнае, забяспечваючы іх узаемадзеянне праз засваенне, трансляцыю і стварэнне культурных каштоўнасцей у асобе і асобай. Сучасны зварот выхавання да культуры як асяроддзя і сродку нараджэння і станаўлення самастойнага вобраза чалавека абумоўлены яе шматфункцыянальнасцю, якая ахоплівае ўсе бакі жыцця грамадства і такім чынам забяспечвае цэласны падыход да развіцця асобы. Культура як сістэма чалавечых каштоўнасцей, якая назапашвалася і ўдасканальвалася на працягу многіх пакаленняў, з'яўляецца змястоўным аспектам адукацыйна-выхаваўчага працэсу. Па сваёй сутнасці культура – гэта сістэма спецыфічна чалавечых спосабаў дзейнасці. Яна ўяўляе сабой не статычную з'яву, а дынамічны працэс, у якім чалавек не толькі ўспрымае, інтэрыярызуе, узбагачае культурныя дасягненні, але і самаразвіваецца як асоба, набываючы ўсё большую свабоду. Адметнай рысай гэтага працэсу выступае гарманічнае ўзаемадзеянне сацыяльных і асобасных патрэбнасцей і інтарэсаў, таму што распрадмечванне і стварэнне культурных каштоўнасцей немагчымы без уключэння творчага патэнцыялу асобы, яе актыўнай самастойнай дзейнасці. Такім чынам, культура выступае не толькі як асяроддзе, што стымулюе развіццё чалавека, але і як механізм, што забяспечвае гэтае развіццё.

Паколькі засваенне, актыўнае вывучэнне і стварэнне новых культурных з'яў з'яўляюцца прасторай для

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыкладання разнастайных відаў чалавечай дзейнасці, у выніку якіх і адбываецца станаўленне чалавека, то можна зрабіць вывад, што вышэйшай мэтай выхавання павінна стаць фарміраванне чалавека культуры. Аналіз прадстаўленых на сённяшні дзень канцэпцый культуралагічнага падыходу да выхавання дае магчымасць вылучыць найбольш значныя рысы, якія выступаюць базавай культурай асобы для яе далейшага самаразвіцця. У якасці вядучых кампанентаў станаўлення чалавека культуры як цэласнай асобы з'яўляюцца наступныя яе характарыстыкі; свабода, г. зн. здольнасць да пошуку і выбару каштоўнасных асноў для рэалізацыі асабістай маральнай жыццёвай пазіцыі; гуманнасць у адносінах да іншых; духоўнасць, творчасць, актыўнасць, якія выяўляюцца ў пошуку шляхоў самавыяўлення праз стварэнне новых каштоўнасцей.

Практычныя падыходы да вырашэння гэтай задачы звязаны з перабудовай выхаваўчага працэсу на падставе ўцягнення самой асобы ў цэласны свет культуры і яе складаючай – мастацтва. Менавіта праз мастацтва адбываецца найбольш адэкватнае спасціжэнне жыцця.

Прыкладам выкарыстання культуралагічнага падыходу ў выхаванні моладзі з'яўляецца дзейнасць навукова-літаратурнага гуртка беларускіх студэнтаў Санкт-Пецярбургскага універсітэта ў пачатку XX ст. Афіцыйна статут гуртка быў зацверджаны ў 1912 г., але шматлікія ўскосныя сведчанні дазваляюць сцвярджаць, што дзейнасць яго пачалася значна раней, у 1906 г., калі студэнты звярнуліся да рэктара за дазволам аб рэгістрацыі гуртка. Ініцыятарам стварэння такога аб'яднання быў Яўген Хлябцэвіч — студэнт гісторыка-філалагічнага факультэта. У ліку яго заснавальнікаў быў і такі вядомы ў будучым дзеяч беларускай культуры, як Б.Тарашкевіч, а таксама яшчэ звыш дзесяці беларускіх студэнтаў. Галоўнымі кірункамі працы гуртка сталі збіранне і распаўсюджванне сярод беларускага грамадства багатай нацыянальнай фальклорнай спадчыны.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Выходзячы з таго, што фальклор з'яўляецца сінкрэтычнай формай духоўнай культуры, у якой філасофія, мастацтва і рэлігія суіснуюць у непадзельным адзінстве, яны разглядалі яго як моцны сродак выхаваўчага ўздзеяння на моладзь, фарміравання яе светапогляду на падставах гуманізму, свабоды, творчага самавыяўлення. Акрамя таго, фальклорная спадчына – гэта незаменны сродак культурнай ідэнтыфікацыі асобы. Усведамленне сваёй прыналежнасці да пэўнай культуры, якое ажыццяўлялася ў працэсе ўспрымання фальклорнай спадчыны, інтэрыярызацыя яе каштоўнасцей, выбар і ажыццяўленне культураадпаведнага стылю жыцця выступаюць важнейшым элементам станаўлення чалавека культуры. Таму ўдзельнікі гуртка ў час канікул актыўна займаліся стварэннем дабрачынных бібліятэк, адчынялі школы на роднай мове, выступалі перад насельніцтвам з лекцыямі і канцэртамі. Вядучым кірункам усёй гэтай дзейнасці было далучэнне чалавека да гістарычна існуючай формы духоўнага існавання нацыі, яе ідэалаў і каштоўнасцей, якія спрадвеку характарызавалі найбольш схаваныя, субстанцыяльныя рысы беларускага народа.

Зварот да такіх напрамкаў культурна-выхаваўчай дзейнасці дазваляе стварыць пэўнае сацыякультурнае асяроддзе, якое стымулюе актыўную дзейнасць асобы па самастойным выбары і ўнутранай рабоце душы, накіраванай на спасціжэнне прынцыпаў свабоды, духоўнасці, творчасці. Таму вопыт нашых продкаў патрабуе больш дасканалага яго вывучэння і ў адпаведнасці з асаблівасцямі новага гістарычнага этапу ўключэння ў мэтанакіраваную праграму выхавання культурнага чалавека.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ